**АКЦЫІ**

# НАЙВАЖНЕЙШЫ КУЛЬТУРНЫ МАРШРУТ

**Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ далучылася да рэспубліканскай акцыі па папулярызацыі беларускай літаратуры пад назвай «Культурны маршрут «Мая Беларусь: сучасныя пісьменнікі – дзецям», абвешчанай Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь у самым пачатку 2018 года.**

Сярод суарганізатараў акцыі значыцца Саюз пісьменнікаў Беларусі. Калектыў Гродзенскага рэгіянальнага падраздзялення пісьменніцкай арганізацыі краіны заўсёды з асаблівай увагай ставіўся да самай юнай чытацкай аўдыторыі. Літаратары Прынёмання – частыя госці ў школах і каледжах. Сяброўскія адносіны ў нашых калег складаюцца з Панямуньскім дзіцячым домам, сустрэчы з выхаванцамі якога сталі добрай традыцыяй. Праца працягваецца. Шматлікія выступленні перад дзецьмі, змястоўная кніжная прадукцыя (павучальныя казкі, займальныя апавяданні, яскравая паэзія на беларускай і рускай мовах) адрасаваная маленькім чытачам, юным грамадзянам Беларусі, а таксама распачатая праца па стварэнні з уласных твораў дапаможніка для пазакласнага чытання для ўстаноў адукацыі – усё гэта абавязковыя пункты на Гродзеншчыне ў прапанаваным дзяржавай "культурным маршруце".

Сустрэча «Паэзія як музыка душы» з вядомым гродзенскім пісьменнікам, Пятром Сямінскім, што адбылася 18 студзеня ў Гродзенскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А.Макаёнка з'яўляецца адным з такіх пунктаў, часткай вялікай шматгадовай працы, працы, якой намі падтрымана акцыя «Мая Беларусь: сучасныя пісьменнікі – дзецям». Пётр Яраслававіч ва ўласцівай яму эмацыйнай манеры, артыстычна чытаў свае вершы аб пачуццях, аб людзях, такія лёгкія, займальныя, з тонкім гумарам. Навучэнцы політэхнічнага каледжа, якія прыйшлі на сустрэчу, задавалі мноства пытанняў. Іх цікавіла, як часта нараджаюцца вершы, як гэта адбываецца, творчасці якога паэта Пётр Яраслававіч аддае перавагу. Слухачы падзякавалі за цікавую сустрэчу, пажадалі паэту-земляку вялікіх творчых поспехаў, новых цікавых вершаў. А ў культурнага маршрута з канцэптуальнай сімволікі акцыі Міністэрства інфармацыі Беларусі з'явіўся новы стратэгічна важны літаратурны ўчастак – **«Мая Гродзеншчына: сучасныя пісьменнікі – дзецям».**

**centrbibl.grodno.by**
**прэс-служба СПБ-ГРОДНА**

**На здымку:** член СПБ, паэт, празаік Пётр Сямінскі на сустрэчы з навучэнцамі Гродзенскага політэхнічнага каледжа ў Гродзенскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А.Макаёнка. 18 студзеня 2018 года.

